ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар Клянніцкага
дзіцячага сада-базавай школы
______________Н.І.Мініч
01.11.2018г.

# ПАЛАЖЭННЕ
## аб музеі Дзяржаўнай установы адукацыі «Клянніцкі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – базавая школа»

1.Агульныя палажэнні.

1.1.Музей воінскай славы партызанскай брыгады "Разгром" Дзяржаўнай установы адукацыі «Клянніцкі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – базавая школа» (далей – Музей) знаходзіцца ў памяшканні Дзяржаўнай установы адукацыі «Клянніцкі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – базавая школа» (далей – Установа).

1.2. Адрас Музея: 222230 вул.Цэнтральная,26, а/г Кляннік, Смалявіцкі раён, Мінская вобласць, Рэспубліка Беларусь.

1.3. Дадзенае Палажэнне распрацавана на аснове метадычных рэкамендацый аб арганізацыі работы музеяў установ адукацыі.

Музей у сваёй дзейнасці кіруецца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры, Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Праграмай бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі на 2016-2020 гг. і Статутам дзяржаўнай установы адукацыі «Клянніцкі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – базавая школа Смалявіцкага раёна».

1.4. Музейныя прадметы, якія захоўваюцца ў Музеі, з'яўляюцца агульнанацыянальным набыткам і падлягаюць дзяржаўнаму ўліку ва ўстаноўленым парадку.

1.5. Тып музея: гістарычны.

1.6. Метадычную дапамогу Музею аказваюць:

• Барысаўскі краязнаўчы музей;
• Смалявіцкі раённы цэнтр турызму і краязнаўства;

2. Мэты і задачы Музея.

2.1. Музей створаны ў дзяржаўнай установе адукацыі «Клянніцкі навучальна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – базавая школа Смалявіцкага раёна» з мэтай далучэння школьнікаў да навукова-даследчай работы, выхавання беражлівых адносін да гісторыка-культурнай спадчыны малой Радзімы, фарміравання маральных каштоўнасцей.

2.2. Музей з’яўляецца адной з форм дадатковай адукацыі ва ўмовах установы адукацыі, развівае актыўнасць, самастойнасць вучняў у працэсе збору, даследавання, апрацоўкі, афармлення і прапаганды матэрыялаў па гісторыі роднага краю, якія маюць выхаваўчую і навукова-пазнавальную каштоўнасць.

2.3. Задачамі Музея з’яўляюцца:

2.3.1.пашырэнне фондаў і экспазіцый Музея, забеспячэнне іх захаванасці;

2.3.2. выкарыстанне гістарычных каштоўнасцей краю для развіцця дзяцей і падлеткаў;

2.3.3. ахова і прапаганда помнікаў гісторыі і культуры;

2.3.4. ажыццяўленне выхаваўчай і адукацыйнай дзейнасці музейнымі сродкамі;

2.3.5. арганізацыя культурна-асветніцкай і іншай дзейнасці, якая дазволена законам, сярод вучняў, педагогаў і насельніцтва.

3. Арганізацыя і дзейнасць Музея.

3.1.Агульнае кіраўніцтва дзейнасцю Музея ўстановы адукацыі ажыццяўляе дырэктар установы адукацыі.

Дырэктар установы адукацыі:

3.1.1. ажыццяўляе непасрэдны кантроль за арганізацыяй дзейнасці Музея;

3.1.2. прызначае загадам па ўстанове адукацыі кіраўніка Музея з ліку педработнікаў;

3.1.3. нясе адказнасць за забеспячэнне ўмоў захавання музейнага фонду;

3.1.4. кіруе фарміраваннем адзінай сістэмы выкарыстання Музея ўстановы адукацыі.

3.2. Работа Музея арганізуецца на аснове самакіравання.

3.3.Непасрэднае кіраўніцтва практычнай дзейнасцю Музея ажыццяўляе кіраўнік Музея, прызначаны загадам дырэктара установы адукацыі.

Кіраўнік Музея:

3.3.1.арганізуе работу вучнёўскага актыву Музея, з якім ажыццяўляе планавую пошукава-збіральніцкую, улікова-захавальную, экскурсійную і выставачную работу;

3.3.2. падтрымлівае сувязь (сустрэчы, гутаркі, перапіска, інтэрв’ю) са сведкамі падзей, навуковымі кансультантамі, прадстаўнікамі рэлігійных, грамадскіх і ўладных структур і дакументуе атрыманыя звесткі ва ўстаноўленым парадку;

3.3.3. вядзе ў інвентарнай кнізе ўлік сапраўдных матэрыялаў, якія паступаюць у Музей, забяспечвае іх сістэматызацыю, правільнае захоўванне і экспаніраванне;

3.3.4. вядзе планавую даследчую работу ў архівах горада, рэспублікі, бібліятэках па камплектаванні музейнага фонду;

3.3.5. забяспечвае сувязь Музея з музеямі горада і рэспублікі;

3.3.6. нясе адказнасць за работу Музея па інфармаванні педагагічнага калектыву і вучняў аб дзейнасці Музея.

3.4. Савет Музея на сваіх пасяджэннях вырашае пытанні ўключэння ў фонды Музея новых музейных прадметаў, разглядае і зацвярджае планы работы; абмяркоўвае асноўныя пытанні дзейнасці Музея: падрыхтоўку лектараў, экскурсаводаў, ажыццяўляе ўдзел у канферэнцыях, выпуск зборнікаў, буклетаў, правядзенне мерапрыемстваў.

3.5.Фінансаванне мерапрыемстваў па стварэнні музейнай экспазіцыі, набыцці дэманстрацыйнай мэблі, вырабу копій дакументаў ажыццяўляецца за кошт бюджэтных і пазабюджэтных сродкаў установы адукацыі.

4. Улік і забеспячэнне захаванасці фондаў Музея.

4.1. Усе музейныя прадметы рэгіструюцца ў інвентарных кнігах уліку.

4.2.Адказнасць за захаванасць фондаў Музея нясе дырэктар установы адукацыі.

4.3.Захаванне ў Музеі выбуховых, радыёактыўных і іншых прадметаў, якія пагражаюць жыццю і бяспецы людзей, катэгарычна забараняецца.

4.4.Захаванне агнястрэльнай і халоднай зброі, прадметаў з каштоўных металаў і камянёў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з існуючым заканадаўствам.

5. Парадак унясення змен у Палажэнне.

5.1. Змены і дапаўненні ў Палажэнне аб Музеі ўносяцца агульным сходам педагагічнага калектыву па ўзгадненні з кіраўніцтвам установы адукацыі.

6. Парадак рэарганізацыі і ліквідацыі Музея.

6.1. Пытанні аб рэарганізацыі Музея, а таксама аб лёсе яго музейных прадметаў вырашаецца Саветам установы адукацыі і яго кіраўніцтвам па ўзгадненні з вышэйстаячымі органамі адукацыі.